# Віншаванне Міністра культуры Рэспублікі Беларусь з Днём бібліятэк



14.09.2012

Шаноўныя бібліятэчныя работнікі!

Выдатна, што ў краіне ёсць такое свята, як Дзень бібліятэк, якое ўжо больш за 10 гадоў з'яўляецца важнай падзеяй у культурным і грамадскім жыцці рэспублікі.

Сёння каля 9,2 тыс. публічных і спецыяльных бібліятэк краіны руплівa захоўваюць звыш 200 млн экзэмпляраў дакументаў, забяспечваюць свабодны доступ грамадзян рэспублікі да інфармацыі і ведаў, ствараюць умовы для духоўнага і маральнага развіцця чытачоў. Іх паслугамі карыстаюцца больш за 3,5 млн чалавек.

Дасягнуты сёння высокі ўзровень нацыянальнай культуры Беларусі бярэ свой пачатак ад першай друкаванай кнігі Францыска Скарыны, нястомнай працы яго паслядоўнікаў – Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага. Аб умацаванні роднай мовы, адукаванасці беларускага народа праз моц роднага слова дбалі песняры беларускага народа.

2012 год – юбілейны для класікаў беларускай літаратуры М.Танка, Я. Купалы і Я. Коласа, а таксама і для галоўнай скарбніцы нашай краіны – Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Таму абвяшчэнне 2012 года Годам кнігі з'явілася лагічным і своечасовым і стала сведчаннем асаблівай увагі дзяржавы да праблем падтрымкі і развіцця чытання, як якаснага складніка сацыялізацыі асобы і развіцця айчыннай культуры.. Укараненне новых інфармацыйных тэхналогій пастунова пераўтварае бібліятэкі ў найважнейшыя інфармацыйныя цэнтры грамадства.

У аўтаматызаваным рэжыме функцыянуюць Нацыянальная бібліятэка Беларусі, усе рэспубліканскія галіновыя і абласныя бібліятэкі. Стварэнне ў перспектыве Нацыянальнай электроннай бібліятэкі дазволіць зніта ваць у інфармацыйнай прасторы кніжныя скарбы гістарычных кнігазбораў і ўвесці іх у культурны і навуковы ўжытак.

Наяўнасць Дня бібліятэк у святочным календары рэспублікі – прызнанне на дзяржаўным узроўні вялікай ступені ўплыву бібліятэк на развіццё ўсіх сфер грамадскага жыцця і адчувальнага сацыяльна-эканамічнага эфекту ад іх дзейнасці, сведчанне ўвагі дзяржавы да працы бібліятэкараў, чые прафесіяналізм, вопыт, самаахвярнасць, творчая энергія і вернасць свайму прызванню выклікаюць бязмерную

павагу.    Перакананы, што беларускія бібліятэкі і надалей будуць заставацца вернымі захавальнікамі мудрасці нацыі, яе спадчыны і вопыту, забяспечваючы жывую повязь пакаленняў.

Са святам!